Аддзел адукацыі, спорту і турызму Рэчыкага раённага выканаўчага камітэта Гомельскай вобласці
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Заспенская сярэдняя школа” Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці

# Патрыятычная акцыя “Я ведаю! Я ганаруся!”

намінацыя - апавяданне

Апавяданне
«Я ведаю! Я ганаруся!»,
Сцельмашок Эліна Вітальеўна,
17.07.2003 г.р., дзяржаўная ўстанова адукацыі “Заспенская сярэдняя школа” Рэчыцкага раёна,
8 клас,
вул.1-я Палявая, д.7, аг.Заспа
настаўнік Ганчарова Жанна Іванаўна

агр. Заспа, Рэчыцкі раён, Гомельская вобласць, 2016

**Я ведаю! Я ганаруся!**

Мой прадзед, Гаўрыленка Марк Мікітавіч, быў удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны. Яго даўно няма сярод жывых, аднак бабуля расказвала не раз мне пра свайго бацьку.

У пачатку вайны прадзед быў прызваны у армію, папаў у акружэнне і апынуўся ў партызанскім атрадзе "За Радзіму", які дзейнічаў на Гомельшчыне. Разам з іншымі партызанамі ён падрываў варожыя цягнікі, хадзіў у разведку, знішчаў нямецкія гарнізоны.

Калі пачалося наступленне Чырвонай Арміі, Марк Мікітавіч прымкнуў да яе і танкістам прайшоў дарогамі вайны.

Свой баявы шлях завяршыў на Далёкім Усходзе, у Манґжурыі.

Нялёгкі яму выпаў лёс. Ён не раз гарэў у танку, быў цяжка паранены ў галаву. Аднойчы у шпіталі яму збіраліся адрэзаць ногі, пасля моцных апёкаў, але ён не згадзіўся. Ногі цудам ўратавалі, аднак да канца жыцця яны ў яго часта балелі, і ён пакутаваў ад гэтага. А ў галаве засталіся асколкі, якія выклікалі пухліну, ад якой ён і памер вельмі рана.

Перажыў мой прадзед і вялікае гора. Яго жонка з двумя дзецьмі загінула ад нямецкай бомбы. Родных Марка Мікітавіча, яго бацьку, маці, двух братоў, фашысты расстралялі, калі ён быў у партызанскім атрадзе. Пасля вайны мой прадзед другі раз ажаніўся, жыў у Лоеве, працаваў шафёрам. Ён пабудаваў вялікі дом, пасадзіў прыгожы сад, вырасціў дзяцей. Толькі ўнукаў і праўнукаў не дачакаўся, бо рана пакінуў гэты свет.

Мой прадзед быў мужным, смелым, любіў жыццё. Ён абараняў родны край ад захопнікаў, яго апаліла вайна. Аднак ён змог пераадолець усе цяжкасці і застацца сапраўдным чалавекам.

Я ганаруся сваім прадзедам!